сацыяльныя і псіхалагічныя праблемы, але і павысіць якасць працы ў сістэме культуры, насычанасць устаноў высокапрафесійнымі кадрамі, палегчыць рашэнне праблем занятасці насельніцтва.

Акрэсленыя задачы не з'яўляюцца адзінымі на сённяшнім этапе развіцця універсітэта, але яны значныя і маштабныя на бліжэйшы навучальны год, іх рашэнне дазваляе вызначыць новыя перспектывы будучыні нашай установы.

***Аксюцік М.І.,** дацэнт*

## ЭКАЛАГІЧНАЯ ПАДРЫХТОЎКА КУЛЬТУРОЛАГАЎ ВА ЎМОВАХ ЗАВОЧНАГА НАВУЧАННЯ

Экалагічная праблематыка ў апошні час усё часцей пераходзіць з агульнатэхнакратычных і эканамічных у шэраг сацыялагічных, культуралагічных і псіхолага-педагагічных пытанняў. Агульная напружанасць у адносінах грамадства і прыроды працягвае існаваць і паглыбляцца з кожным днём. Звязана гэта, на наш погляд, з тым, што акцэнты ў сацыяльнай рабоце па-ранейшаму робяцца на вырашэнні канкрэтных экалагічных праблем, а гаворку трэба весці перш за ўсё аб шырокай экалагічнай адукацыі і экалагічным выхаванні насельніцтва. Неабходна пачынаць не з "бяздушных" шкодных тэхналагічных працэсаў, а з экалагізацыі свядомасці іх стваральнікаў, з фарміравання агульнай экалагічнай культуры людзей.

Значную ролю ў экалагічным выхаванні насельніцтва могуць адыграць будучыя спецыялісты-культуролагі (менеджэры сацыякультурнай сферы, сацыяльныя педагогі, рэжысёры масавых свят і інш.), падрыхтоўка якіх ажыццяўляецца ў Беларускім універсітэце культуры. Вялікая колькасць цікавых форм і метадаў дзейнасці ў вольны час дазваляе эфектыўна ажыццяўляць экалагічнае выхаванне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рознаўзроставых груп людзей, рабіць гэтую работу больш дзейснай і прывабнай.

Асобную ролю мы адводзім студэнтам завочнага навучання, штодзённая практычная дзейнасць якіх сёння максімальна набліжана да сучаснай сацыякультурнай сітуацыі. Практыка паказвае, што многія з іх ужо цяпер з поспехам ажыццяўляюць культурную дзейнасць па экалагічным выхаванні, асабліва дзяцей і моладзі, працуючы ў розных культасветустановах рэспублікі.

Сярод агульных праблем завочнага навучання ўвогуле і экалагічнай падрыхтоўкі студэнтаў-завочнікаў у прыватнасці ў рамках дадзенага артыкула адзначым дзве асноўныя.

1. Фарміраванне ў студэнтаў-завочнікаў устойлівай устаноўкі на пастаянную і паглыбленую работу са спецыяльнай абавязковай і дадатковай літаратурай па курсе.

2. Максімальнае прыбліжэнне методыкі навучання да рэальнай практыкі сацыякультурнай дзейнасці, магчымасць яе хуткай адаптацыі ў канкрэтным рэгіёне альбо ўстанове культуры, бо гэта дазваляе глыбока вывучыць праблему.

Агульнавядома, што асноўная вучэбная праца студэнта-завочніка прыпадае на тэрмін сесіі два разы ў год, і таму вялікая колькасць інфармацыі, атрыманая ім у гэты перыяд, не заўсёды добра засвойваецца, а назапашаныя веды падчас не паспяваюць перайсці ва ўменні і навыкі. Таму неабходна так будаваць працэс навучання, каб студэнт-завочнік меў устойлівую матывацыю да работы з рэкамендаванай літаратурай у перыяд паміж сесіямі з магчымай перспектывай укаранення той альбо іншай формы культурнай дзейнасці ў сваёй штодзённай працы.

Для вырашэння вышэйазначаных праблем у межах вучэбнага курса “Сацыяльная дзейнасць” і практыкуму па СКД “Экалогія і культура” была распрацавана методыка аптымізацыі экалагічнай падрыхтоўкі студэнтаў завочнага навучання па спецыялізацыі “менеджэр сацыякультурнай сферы”. Ніжэй мы прапануем структуру і змест распрацаванай методыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адна з галоўных дысцыплін спецыялізацыі "сацыякультурная дзейнасць" (СКД) выкладаецца студэнтам-завочнікам на II, III курсах. Паралельна на III курсе яны знаёмяцца з практыкумам "Экалогія і культура", які ў многім звязаны з асноўным курсам СКД. Так, адна з апошніх тэм прысвечана методыцы арганізацыі дзейнасці аматарскіх аб'яднанняў у вольны час. Сярод мноства клубаў па інтарэсах робіцца акцэнт на дзейнасці клубных аб'яднанняў экалагічнага накірунку: клубы аматараў прыроды, аматараў хатніх жывёлін, раслін і інш. На перыяд паміж сесіямі студэнты ФЗН атрымоўваюць заданне распрацаваць мадэль экалагічнага клуба, якая ўключае:

— агульнае палажэнне аб экалагічным клубе,
— статут экалагічнага клуба,
— план работы клуба на год,
— сцэнарны план аднаго з пасяджэнняў клуба.

Для выканання задання студэнтам прапануецца спіс спецыяльнай літаратуры, вывучэнне і выкарыстанне якой дапамогуць у распрацоўцы мадэлі. Улічваючы той факт, што практычнае стварэнне падобных клубаў не выклікае нейкіх асабістых намаганняў і выдаткаў, для многіх студэнтаў гэтая мадэль уяўляе пэўную практычную цікавасць.

Звернемся спачатку да некаторых тэарэтычных пытанняў экалогіі і экалагічнага выхавання, на якіх засяроджваецца ўвага студэнтаў ФЗН у рабоце з рэкамендаванай літаратурай. Засваенне матэрыялу па гэтых пытаннях дае магчымасць для распрацоўкі агульнага палажэння аб экалагічным клубе і яго статута.

Адчуванне прыроды, мабыць, уласціва для чалавека ад нараджэння, таму што мы самі з'яўляемся часткай гэтай прыроды і на працягу ўсяго жыцця звязаны з ёй. Аднак праявы гэтай сувязі залежаць ад культуры і ўзроўню развіцця грамадства.У свядомасці першабытнай асобы існаваў адзіны вобраз чалавека і прыроды. Чалавек разглядаўся як адна з істот прыроды, аднак як найвышэйшая з іх. Прырода была адной з састаўных частак старажытнай

рэлігійна-міфалагічнай карціны свету. Вучоныя называюць гэта сінкрэтызмам светаўспрымання старажытнага чалавека.

У працэсе цывілізацыі становішча істотна мяняецца. Чалавек аддаляецца ад прыроды, нават пачынае проціпастаўляць сябе ёй. Гэтаму спрыяюць практычная дзейнасць, спосаб жыцця цывілізаванага чалавека. Штодзённая свядомасць людзей апынулася ў палоне недалёкага практыцызму. І толькі паэты, празаікі, жывапісцы працягваюць апяваць прыроду, яе веліч, прыгажосць, гаючую сілу, ды вучоныя - прыродазнаўцы імкнуцца пераканаць чалавека змяніць свае адносіны да прыроды. Адзін з такіх вучоных — У.І.Вярнадскі (1863 — 1945), акадэмік, заснавальнік геахіміі, радыёгеалогіі, аўтар прац па філасофіі прыродазнаўства, стваральнік тэорыі аб біясферы. Біясфера, паводле У.І.Вярнадскага, – гэта агульнапланетарная абалонка Зямлі, дзе існуе альбо існавала жыццё. Асаблівую цікавасць для нас уяўляе вучэнне У.І.Вярнадскага аб наасферы як “сферы розуму”, якую ўсё чалавецтва павінна агульнымі намаганнямі пабудаваць у бліжэйшы час. Калі чалавек не зробіць свае адносіны да прыроды рацыянальнымі і беражлівымі, не арганізуе акружаючую яго біясферу “па розуму”, то ён сам загіне ў хуткім часе як біялагічная адзінка.

Значны ўклад у фарміраванне экалагічнай свядомасці чалавека ўнёс у мінулым стагоддзі амерыканскі філолаг, паэт, пісьменнік Генры Дэвід Тора (1817 — 1862). Ён на два гады пакідае цывілізаваны свет і селіцца ў лесе на беразе Уолдэнскай сажалкі. Там ён піша цудоўную кнігу “Уолдэн, альбо Жыццё ў лесе”, у якой на сваім асабістым вопыце паказвае, што жыццё ў поўнай гармоніі з прыродай не проста магчыма, а яно становіцца больш поўным, асэнсаваным, бо пазбаўлена штодзённай мітусні. У яго творы прырода прысутнічае як неад’емная частка чалавечага існавання, без якой немагчыма сапраўднасць быцця.

Гэтыя і многія іншыя ідэі прывялі да таго, што ў 1869 годзе ў навуковым асяроддзі з’яўляецца паняцце “экалогія”. Яго ўводзіць нямецкі біёлаг Эрнст Гекель. Ён сцвярджае ідэю балансу паміж жывымі арганізмамі і навакольным

асяроддзем. Слова "экалогія" паходзіць ад двух грэчаскіх слоў: "ойкас", што азначае дом ці месца жыхарства, і "логас" – навука, вучэнне. Экалогія – гэта навука аб тым, як жыць у згодзе з прыродай.

Паняцце "экалагічнае выхаванне" з'явілася ў савецкай педагогіцы ў другой палове XX стагоддзя. Вучоныя ставяцца да яго неадназначна. Адны разглядаюць яго як працэс ("сістэма мэтанакіраванага ўздзеяння"), другія – як вынік ("нормы паводзін"). Паколькі гэтыя погляды не супярэчаць, а хутчэй дапаўняюць адзін аднаго, то паняцце экалагічнага выхавання можна разглядаць як сістэму мэтанакіраванага ўздзеяння на свядомасць і паводзіны аб'екта для фарміравання ў яго сацыяльна значных нормаў паводзін у адносінах да прыроды.

Спецыфіка экалагічнага выхавання заключаецца ў тым, што яно, маючы свае спецыфічныя сродкі, формы і метады, адначасова цесна пераплятаецца з грамадскім, працоўным, патрыятычным, маральна-эстэтычным і іншымі накірункамі выхавання. Значыць, для ажыццяўлення працэсу экалагічнага выхавання насельніцтва ва ўстановах культуры неабходна напаўняць экалагічным зместам формы культурнай дзейнасці ў вольны час: экалагічныя старонкі вечароў адпачынку, экалагічныя эпізоды культурна-масавых мерапрыемстваў і да т.п.

Мы вышэй адзначылі, што агульнатэарэтычны матэрыял, засвоены студэнтамі-завочнікамі, дапаможа ім распрацаваць палажэнне аб экалагічным клубе і яго статут.

У рабоце над планам работы экалагічнага клуба на год і сцэнарным планам аднаго з пасяджэнняў студэнту дапаможа наступная інфармацыя, якая тычыцца арганізацыі працэсу экалагічнай прапаганды і экалагічнай дзейнасці ў клубных установах.

Улічваючы сутнасць клубнай работы, у якасці аднаго з асноўных фактараў выніковасці экалагічнай прапаганды абгрунтуем неабходнасць выкарыстання маральна-эстэтычнага аспекту экалагічнага выхавання, які спрыяе развіццю ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

наведвальнікаў клуба патрэбных цесных зносін з прыродай, развівае ўменне бачыць яе прыгажосць.

На сучасным этапе развіцця грамадства вельмі важна зразумець эстэтычную вартасць прыроды ў развіцці асобы. Што тычыцца работы клубных устаноў, то яны маюць вялікі арсенал сродкаў, форм і метадаў эстэтычнага ўздзеяння на асобу. Вызначым тры асноўныя напрамкі, якія дазваляюць клубам выкарыстоўваць маральна-эстэтычныя аспекты экалагічнага выхавання.

1. Фарміраванне любові да прыроды праз творы мастацтва і літаратуры. Паэзія і проза, музыка і жывапіс, кіно і тэатр – усё гэта эфектыўныя сродкі, з дапамогай якіх у літаратурна-музычных кампазіцыях, на вечарах паэзіі, выставах і ў кіналекторыях, на самых розных масавых мерапрыемствах, прысвечаных прыгажосці прыроды, выхоўваюцца правільныя ўзаемаадносіны са светам прыроды. Выкарыстоўваючы ў клубных мерапрыемствах творы літаратуры і мастацтва, якія паказваюць адвечную прыгажосць прыроды і яе эстэтычную вартасць, можна выхаваць у чалавека здольнасць у сучасных умовах разумна і беражліва адносіцца да прыродных багаццяў, бачыць і ацэньваць цудоўнае ў навакольным асяроддзі.

2. Выхаванне любові да прыроды сродкамі самой прыроды. Прыгажосць лясоў і палёў, свету жывёл і раслін – дзейсны сродак выхавання чалавека. Клубныя ўстановы могуць узяць на сябе арганізацыю вандровак, выездаў на ўлонне прыроды, распрацоўку маршрутаў экалагічных сцежак, прыродазнаўчых экскурсій і інш.

3. Стымуляванне экалагічнай дзейнасці, якая мае на мэце навучыць чалавека ствараць прыгожае ў прыродзе. Клуб можа ўзяць на сябе ініцыятыву па стварэнні аматарскіх аб'яднанняў і ініцыятыўных груповак, якія арганізуюць разнастайную дзейнасць – ад стварэння цікавых рэчаў з прыроднага матэрыялу да масавых экалагічных кампаній.

Увогуле ў экалагічнай дзейнасці, якая ажыццяўляецца ў клубных установах, можна вылучыць чатыры асноўныя напрамкі:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

— практычнае асваенне прыроднага асяроддзя з мэтай стварэння, вытворчасці матэрыяльных каштоўнасцей;

— ахова прыродных сістэм ад негатыўнага ўздзеяння чалавечай дзейнасці;

— рэстаўрацыя знішчаных альбо знікаючых прыродных сістэм;

— якаснае развіццё, паляпшэнне прыродных сістэм з пазіцыі сацыяльных мэт (кветкаводства, селекцыя і інш.).

З пункту гледжання арганізацыі культурнай дзейнасці ў вольны час нас перш за ўсё цікавяць 2-гі, 3-ці, 4-ты напрамкі. Зразумела, што клубы ажыццяўляюць і іншую дзейнасць. Гэта можа быць, напрыклад, **рэкрэацыйная** (выезды на прыроду групоўкі ці сулолкі), **экалагічна зарыентаваная** (клубы аматараў хатніх жывёл, птушак, раслін), **сацыяльна экалагічная** (аматарскія аб'яднанні, якія ставяць на мэце ахову і развіццё навакольнага асяроддзя) дзейнасць.

Студэнт-завочнік выбірае профіль аматарскага аб'яднання, мадэль якога яму патрэбна распрацаваць. Прачытаўшы рэкамендаваную літаратуру ў міжсесіённы перыяд, выконвае заданне. Гэта заданне прадугледжвае стварэнне клубнага аб'яднання экалагічнага напрамку ў рэальнай сацыякультурнай сітуацыі свайго рэгіёна.

***Баравік В.І.,***
***Лесава Л.Б.,***
*ст. выкладчыкі*

## КАНТРОЛЬ ЗА САМАСТОЙНАЙ РАБОТАЙ СТУДЭНТАЎ-ЗАВОЧНІКАЎ ПА ЗАМЕЖНЫХ МОВАХ У МІЖСЕСІЁННЫ ПЕРЫЯД

Імклівыя тэмпы назапашвання інфармацыі, пашырэнне міжнародных сувязей выклікаюць патрэбу ў тым, каб сёння спецыяліст, які працуе ў любой галіне, умеў карыстацца і нацыянальнай, і замежнай літаратурай. Гэта



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ